ТОЛЬКІ ТАК!

СПРАВАВОДСТВА па-БЕЛАРУСКУ!

Сакавік-2, 2016

ДЭПУТАТЫ І ПРАВЫ БЕЛАРУСКАМОЎНЫХ СПАЖЫЎЦОЎ

- Пазіцыя дэпутата Пачынака

- Пазіцыя дэпутата Шчэпава

- Пазіцыя дэпутата Валчанкова



НАЦЫЯНАЛЬНЫ СХОД
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
ДЭПУТАТ
ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ
вул. Савецкая, 11, 220010, г. Мінск

НАЦИОНАЛЬНОЕ СОБРАНИЕ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
ДЕПУТАТ
ПАЛАТЫ ПРЕДСТАВИТЕЛЕЙ
ул. Советская, 11, 220010, г. Минск

5.03.2016 № 12-31

Случаку І.У.



246012, г. Гомель

Паважаны Ігар Уладзіміравіч!

На Ваш ліст ад 01.03.2016 паведамляю, што згодны з прапановай па давядзенню да ведама спажыўца інфармацыі на беларускай мове на ўпакоўках, этыкетках і прыкладаемых да тавараў дакументах.

Пры разглядзе ў Палаце прадстаўнікоў законапраекта па ўнясенні адпаведных змяненняў я яго падтрымаю.

З павагай,

Дэпутат
Палаты прадстаўнікоў
Нацыянальнага сходу
Рэспублікі Беларусь

М.І.Пачынак

НАЦЫЯНАЛЬНЫ СХОД
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
ДЭПУТАТ
ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ

вул. Савецкая, 11, 220010, г. Мінск

НАЦИОНАЛЬНОЕ СОБРАНИЕ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
ДЕПУТАТ
ПАЛАТЫ ПРЕДСТАВИТЕЛЕЙ

ул. Советская, 11, 220010, г. Минск

10.03.2016 № 110

Случаку І.У.

Паважаны Ігар Уладзіміравіч!

Інфармую Вас, што мною разгледжаны Ваш чарговы зварот па пытанні ўнясенні змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб абароне правоў спажыўцоў».

Ваша прапанова мае пад сабой падставу. У выпадку ўнясення ў Палату прадстаўнікоў адпаведнага законапраекта, я падтрымаю яго прыняцце.

Аднак хачу заўважыць, што прапанаваныя Вамі змяненні патрабуюць дасканалага аналізу і экспертызы. Гэта і вывучэнне фінасава-эканамічнай мэтазгоднасці прапанаваных замяненняў, так яны могуць сур'ёзна паўплываць на выдаткі вытворцаў тавараў і паслуг, а значыць і наступленні ў бюджэт.

Акрамя таго, адначасова з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб абароне правоў спажыўцоў» трэба ўнесці адпаведныя змяненні для ўрэгулявання адносін, звязанных з забеспячэннем дадатковых заканадаўчых гарантый ужывання дзяржаўных моў, у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь».

Дэпутат У.А.Шчэпаў

НАЦЫЯНАЛЬНЫ СХОД РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
ДЭПУТАТ
ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ
вул. Савецкая, 11, 220010, г. Мінск

НАЦИОНАЛЬНОЕ СОБРАНИЕ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
ДЕПУТАТ
ПАЛАТЫ ПРЕДСТАВИТЕЛЕЙ
ул. Советская, 11, 220010, г. Минск

11.03.16г. № 13-110/06

Случаку І.У.

[redacted],
246012, г. Гомель

Паважаны Ігар Уладзіміравіч!

Уважліва разгледзеўшы Ваш зварот наконт унясеня змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб абароне правоў спажыўцоў», адзначаю, што ў цяперашні час разгледзець станоўча прапанову, якая змяшчаецца ў звароце, не ўяўляецца магчымым.

Разам з тым яна заслугоўвае увагі і пры паступленні ў Палату прадстаўнікоў адпаведнага законапраекта будзе прапанавана мною да разгляду.

З павагай,

А.А.Валчанкоў

M&S MEDIA

Уладальнікі выдання *M&S Media*

Заснавальнік: *Францыск Піцерскі*
Галоўны рэдактар: *Алесь Пыхаў*
Карэктар: *Мікола Хмызняк*

246050, г. Гомель, вул. Пуліхава, 17,
рэдакцыя "Справаводства па-Беларуску"

Надрукавана на
Папяровай фабрыцы "ГумНо", г. Клінцы,
вул. Мажаеўская, 17б.

Тыраж: 250 асобнікаў.

Распаўсюджваецца безкаштоўна.



Архіў газеты "Справаводства па-беларуску!" ў Беларускай інтэрнэт-бібліятэцы KAMUNIKAT:
http://kamunikat.org/spravavodstva_pa_bielarusku.html

Архіў УКантакце:
http://vk.com/docs?oid=-19441275

Мы ў сацыяльных сетках:
vk.com: spravavodstva_pa_belarusku
facebook.com: spravavodstva

M&S MEDIA